*УДК 94(476)«1941-1944»*

# ТРУДОВАЯ ПОВСЕДНЕВНОСТЬ В ОККУПИРОВАННОЙ БЕЛАРУСИ В 1941–1944 гг. (ПО МАТЕРИАЛАМ ГЕРМАНСКИХ ТРОФЕЙНЫХ ДОКУМЕНТОВ)

***А. Г. ЦЫМБАЛ***[1)]

[1)]*Минский государственный лингвистический университет, ул. Захарова, 21, 220034, г. Минск, Беларусь*

На основе германских трофейных документов исследуется трудовая повседневность белорусских граждан в годы германской оккупации. Источниковую базу статьи составили материалы фонда 378 Национального архива Республики Беларусь. Документы дают представление о многих аспектах оккупационной жизни сквозь призму деятельности одного учреждения – Главной железнодорожной дирекции «Минск» – и проливают свет на многие белые пятна трудовой повседневности населения Беларуси. Представленное исследование имеет целью в первую очередь ввести в научный оборот значительный комплекс фактического материала по проблеме трудовой повседневности и использования оккупационными властями труда населения Беларуси. Это представляет проблему в новом ракурсе и создает фактологическую основу для дальнейшего изучения вопроса на концептуальном уровне. Документальные источники позволяют дополнить существующие оценки использования оккупантами труда местного населения исключительно как принудительного рабского труда. Используя новые источники и современные методологические подходы, следует обратиться к анализу стратегий выживания простых людей в условиях оккупации. Информация источников коллекции документов Главной железнодорожной дирекции «Минск» ставит перед исследователями вопросы об условиях выживания местных работников на других предприятиях, в других сферах труда и регионах оккупированной территории Беларуси.

***Ключевые слова:*** трудовая повседневность; оккупация; Беларусь; железная дорога; германские трофейные документы.

# ПРАЦОЎНАЯ ШТОДЗЁННАСЦЬ У АКУПАВАНАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1941–1944 гг. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ГЕРМАНСКІХ ТРАФЕЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ)

***А. Г. ЦЫМБАЛ***[1*]

[1*]*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, вул. Захарава, 21, 220034, г. Мінск, Беларусь*

На аснове германскіх трафейных дакументаў даследуецца працоўная штодзённасць беларускіх грамадзян у гады германскай акупацыі. Базу крыніц артыкула склалі матэрыялы фонду 378 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Дакументы даюць уяўленне аб многіх аспектах акупацыйнага жыцця праз прызму дзейнасці адной установы – Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» – і праліваюць святло на шматлікія белыя плямы працоўнай штодзённасці насельніцтва Беларусі. Прадстаўленае даследаванне мае на мэце ў першую чаргу ўвесці ў навуковы зварот значны комплекс фактычнага матэрыялу па праблеме працоўнай штодзённасці і выкарыстання акупацыйнымі ўладамі працы насельніцтва Беларусі. Гэта прадстаўляе праблему ў новым ракурсе і стварае факталагічныя падставы для далей-

**Образец цитирования:**
Цымбал АГ. Працоўная штодзённасць у акупаванай Беларусі ў 1941–1944 гг. (па матэрыялах германскіх трафейных дакументаў). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2019;3:15–25.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-3-15-25.

**For citation:**
Tsimbal AG. Everyday labour life in occupied Belarus in 1941–1944 (on the basis of the German trophy documents). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2019;3:15–25. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2019-3-15-25.

**Автор:**
***Александр Георгиевич Цымбал*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории, мировой культуры и туризма.

**Author:**
***Alexander G. Tsimbal***, PhD (history), docent; associate professor at the department of history, world culture and tourism.
*aleksander.g.t@gmail.com*

шага вывучэння пытання на канцэптуальным узроўні. Дакументальныя крыніцы дазваляюць дапоўніць ацэнкі выкарыстання акупантамі працы мясцовага насельніцтва выключна як прымусовай рабскай працы. Выкарыстоўваючы новыя крыніцы і сучасныя метадалагічныя падыходы, варта звярнуцца да аналізу стратэгій выжывання простых людзей ва ўмовах акупацыі. Інфармацыя крыніц калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» ставіць перад даследчыкамі пытанні аб умовах выжывання мясцовых работнікаў на іншых прадпрыемствах, у іншых сферах працы і рэгіёнах акупаванай тэрыторыі Беларусі.

***Ключавыя словы:*** працоўная штодзённасць; акупацыя; Беларусь; чыгунка; германскія трафейныя дакументы.

# EVERYDAY LABOUR LIFE IN OCCUPIED BELARUS IN 1941–1944 (ON THE BASIS OF THE GERMAN TROPHY DOCUMENTS)

***A. G. TSIMBAL***[a]

[a]*Minsk State Linguistic University, 21 Zacharava Street, Minsk 220034, Belarus*

Everyday work of Belarusian citizens during the German occupation is explored on the basis of German trophy documents. The article is based on the materials of the Fund 378 of the National Archives of the Republic of Belarus. The documents give an idea of many aspects of occupational life through the prism of the activities of one institution – the Main Railway Directorate «Minsk» and shed light on many «white spots» of the everyday work of the population of Belarus. The presented study aims, first of all, to introduce into scientific circulation a significant set of factual material on the problem of everyday work and the use of local people labour by the occupation authorities. That shows the problem from a new perspective and creates factual basis for further conceptual study of the issue. The German occupation authorities gave exceptional importance to the issue of gaining the support of the population of Belarus. With this purpose, they developed directive documents, analyzed the mood and labour potential of local workers. Using the method of «carrots and sticks», the railway management in occupied Belarus understood that it depended on the local population, therefore, in addition to repressive methods and the organization of the control system, the issues of providing products and creating social guarantees were raised. The wage premiums, bonuses, rewards, delivery of products and delicacies, charity and assistance to the families of employees were supposed to increase productivity and stimulate the work of local railway workers. However, the occupation authorities regularly noted a low desire to work and the escape of local workers to the partisans. The introduction to the scientific turnover of the information of the unique documents of Main Railway Directorate «Minsk» can not only significantly extend the factual basis of the research of the period of German occupation of Belarus, but also pose a number of theoretical questions. New documentary sources make it possible to add to the currently existing assessment of the use of labour by the local population solely as betrayal or forced slave labor. Using new sources and modern methodological approaches, the survival strategies of ordinary people under occupation should be analyzed. Information sources of the collection of documents of the Main Railway Directorate «Minsk» raise questions about the conditions of survival of local workers at other enterprises, in other fields of labour and regions of the occupied territory of Belarus.

***Keywords:*** everyday labour life; occupation; Belarus; railway; German trophy documents.

Працоўныя рэсурсы акупаванай Беларусі з'яўляліся галоўным аб'ектам германскай эканамічнай палітыкі. Ужо з лета 1941 г. выкарыстанне працы беларускіх грамадзян у інтарэсах германскага рэйха набывае каласальныя памеры. Пытанні працоўнай штодзённасці доўгі час не знаходзіліся ў цэнтры ўвагі даследчыкаў. Дэталёвае і грунтоўнае вывучэнне праблемы сутыкалася з абмежаванасцю базы крыніц, а таксама з асаблівасцямі метадалогіі даследавання. Дамінуючы ў савецкія часы класавы падыход штучна спрашчаў і абмяжоўваў магчымасці вывучэння праблемы. Жорсткае структураванне грамадства на рабочы клас, сялянства і інтэлігенцыю пакідала па-за межамі даследавання остарбайтараў, рамеснікаў, ваеннапалонных, інвалідаў, дзяцей, удоў, душэўнахворых і інш. Выдадзеныя ў савецкі час працы і зборнікі дакументаў звярталі ўвагу на вываз насельніцтва, але прымусовая праца атаясамлівалася з палонам[1]. Асэнсаванне прымусовай працы ў гады акупацыі адбывалася праз выкарыстанне паняццяў «прыгон», «катаржная праца»[2]. Па-за ўвагай заставаліся пытанні метадаў і форм прымусу, матэрыяльнага і прававога становішча насельніцтва пад акупацыяй. Не вывучалася праца насельніцтва ў кантэксце пошуку шляхоў выжывання ва ўмовах вайны і акупацыі, а праца на акупацыйныя структуры разглядалася фактычна як здрадніцтва. Менавіта гэта тэма з'яўлялася ад-

[1]Документы обвиняют. Сборник документов о чудовищных зверствах германских властей на временно захваченных ими советских территориях. Вып. 1 / Чрезвычайн. гос. комис. по установлению и расследованию злодеяний нем.-фашист. захватчиков и их сообщников. М. : ГИПЛ, 1943. С. 15–20.

[2]Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии, 1941–1944 / Центр. гос. арх. Окт. революции и социалист. стр-ва БССР, Ин-т истории партии при ЦК КПБ. Минск : Беларусь, 1965. С. 7–8.

ной з самых вострых і ў той жа час замоўчаных у гістарыяграфіі.

Распад СССР і змена грамадска-палітычнай сітуацыі, адкрыццё архіваў і метадалагічны плюралізм стварылі новыя магчымасці для даследавання выкарыстання мясцовых працоўных рэсурсаў у часы нацысцкай акупацыі. З’явіліся працы, прысвечаныя гісторыі беларускіх остарбайтараў [1], якія раскрываюць агульныя пытанні палітыкі нацысцкага кіраўніцтва адносна беларускіх зямель, паказваюць полаўзроставую структуру остарбайтараў, называюць дакладныя лічбы вывезенага ў Германію насельніцтва. Пытанні штодзённасці остарбайтараў у Германіі разглядала А. Корсак[3].

Вывучэнне становішча грамадзянскага насельніцтва праз канцэпт прымусовай ці рабскай працы атрымала далейшы працяг у выданнях «Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944)» [2] і «Вяртанне ў рабства. Прымусовая праца насельніцтва Беларусі, 1941–1945» [3]. Даследаванні актуалізуюць праблему на новым навуковым узроўні на падставе матэрыялаў архіваў Беларусі і Германіі, раскрываючы механізмы функцыянавання працоўнай павіннасці, уздымаюць пытанні працоўных рэзерваў, прымусовай працы яўрэйскага насельніцтва, матэрыяльнага становішча працоўных, арганізацыі і дзейнасці калабарацыйных прафсаюзаў, вярбоўкі і мабілізацыі на працу ў Германію. Работы паказваюць праблему як у агульнарэспубліканскім маштабе, так і праз аналіз становішча асобных акруг у гады акупацыі. Адзін з аўтараў вышэйназваных выданняў – С. Я. Новікаў – адзначае, што трагедыя грамадзян, якія знаходзіліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі, заключалася ў тым, што «ў імя захавання далейшага жыцця саміх сябе і сваіх родных, заняцця пэўнага становішча ў савецкім грамадстве патрэбна было замоўчваць шматлікія факты ваеннага часу, у тым ліку факты гісторыі працоўнай паўсядзённасці перыяду нацысцкай акупацыі» [2, с. 134].

Беларускім гісторыкам Я. Грэбнем было абаронена дысертацыйнае даследаванне, прысвечанае праблеме прыцягнення грамадзян Беларусі на прымусовыя работы[4]. У 2016 г. ім выдадзена манаграфія аб становішчы грамадзянскага насельніцтва ва ўмовах нямецкай акупацыі. Дэталёва раскрываючы пытанні рэгламентацыі жыцця, сацыяльна-побытавых умоў і крыніц выжывання насельніцтва, аўтар падкрэслівае, што само жыццё ва ўмовах акупацыі з’яўлялася подзвігам [4, с. 493].

Нямецкая гістарыяграфія праблемы выкарыстання працы насельніцтва захопленых краін прадстаўлена ў першую чаргу работамі У. Герберта. Ствараючы агульную карціну прымусовай працы ў рэйху, аўтар асобна раскрывае становішча савецкай працоўнай сілы і звяртаецца да наступных пытанняў штодзённасці: харчаванне, кваліфікацыя, заработная плата, становішча дзяцей і інш. [5, S. 192, 198, 287].

Пытанне дыферэнцыяцыі працоўнай сілы, якая выкарыстоўвалася ў ваеннай эканоміцы Германіі і на акупаваных тэрыторыях, узняў М. Шпёрэр. У якасці крытэрыяў такой дыферэнцыяцыі ў яго выступаюць месцазнаходжанне, род заняткаў і магчымасці выжывання [6, S. 16–17].

Германская эканамічная палітыка і палітыка знішчэння насельніцтва ў Беларусі знаходзяцца ў цэнтры ўвагі Х. Герлаха [7]. У першай частцы сваёй фундаментальнай працы аўтар раскрывае палітыку адносна рабочай сілы праз стварэнне адпаведных акупацыйных органаў, вынікаў іх дзейнасці. Апісаны таксама метады і праблемы зносін з мясцовым насельніцтвам, вярбоўка рабочай сілы, формы прымусовага захопу, метады і сродкі, якія выкарыстоўваў акупацыйны рэжым для захавання патэнцыялу рабочай сілы ў межах самой Беларусі.

Найбольш вядомай працай, якая стварае перспектыву становішча насельніцтва акупаванай Беларусі з пазіцыі штодзённасці, з’яўляецца даследаванне Б. К’яры «Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 г.)» [8]. Пытанні менавіта працоўнай штодзённасці ў аўтара не выступаюць у якасці асноўнага аб’екта даследавання. Для нашай працы карысным падаецца наступная метадалагічная заўвага даследчыка: «Каб адэкватна выбудаваць неабсяжны сцэнар як зручны інструмент, магла б разглядацца мікрагісторыя – гэта значыць даследаванне канкрэтнай вёскі, горада, прадпрыемства або вайсковае часткі ці пэўнае сям’і. Стан наяўных крыніцаў не дазволіў пайсці гэткім шляхам» [8, с. 23].

Дадзены артыкул з’яўляецца спробай часткова вырашыць адзначаную Б. К’яры праблему і раскрыць з перспектывы штодзённасці і мікрагісторыі асаблівасці становішча і працы мясцовага насельніцтва на прыкладзе асобнай установы – Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск». Дырэкцыя мела філіялы і прадпрыемствы па ўсёй тэрыторыі Беларусі з нямецкім і мясцовым рабочым персаналам. Выключную значнасць для раскрыцця тэмы працоўнай штодзённасці ўяўляюць трафейныя германскія дакументы, асабліва калекцыя Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» (фонд 378 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь). Яна ўяўляе сабой значны комплекс крыніц, якія ўключаюць вялікую колькасць паведамленняў статыстычнага характару аб колькасці рабочай сілы з ліку нямецкіх работнікаў

[3] *Корсак А. І.* Штодзённасць жыцця остарбайтараў з Віцебскай вобласці ў нацысцкай Германіі (1941–1945 гг.) // Вестн. Полоц. гос. ун-та. 2010. № 1. С. 73–78.

[4] *Гребень Е. А.* Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941–1944 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 2005.

і мясцовых жыхароў, незадаволенай патрэбе ў персанале чыгуначнага прадпрыемства «Дойчэ Райхсбан», звесткі аб ваеннапалонных і яўрэях, якія былі задзейнічаны на работах. Матэрыялы змяшчаюць разнастайную інфармацыю аб дырэктыўных дакументах па арганізацыі працы мясцовых работнікаў, аб прафесіях, на якія быў найбольшы попыт у акупацыйных улад, галоўных напрамках службы, харчовым забеспячэнні работнікаў, умовах працы, апісваюць праблематыку ўздзеяння партызанскіх фарміраванняў на германскія спробы больш маштабнага выкарыстання мясцовага насельніцтва. Прадстаўленае даследаванне мае на мэце ў першую чаргу ўвесці ў навуковы зварот значны комплекс фактычнага матэрыялу па праблеме працоўнай штодзённасці і па выкарыстанні акупацыйнымі ўладамі працы насельніцтва Беларусі, які прадстаўляе праблему ў новым ракурсе і на падставе якога магчымае далейшае вывучэнне пытання на канцэптуальным узроўні.

Пасля нападу нацысцкай Германіі на Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 г. быў выдадзены загад А. Гітлера кіраўніцтву Імперскага міністэрства транспарту аб неабходнасці арганізацыі і стварэння чыгуначных камунікацый на акупаваных тэрыторыях СССР. Работы ў гэтым кірунку пачаліся 30 чэрвеня 1941 г.[5] Папярэднім месцам знаходжання дырэкцыі павінен быў стаць Брэст-Літоўск. У сувязі з імклівым наступленнем нямецкіх войскаў ужо праз месяц яна была пераведзена ў Мінск. З 14 студзеня 1942 г. Галоўная чыгуначная дырэкцыя вылучылася з падраздзяленняў вермахта і была перададзена ў кіраванне Імперскаму міністэрству транспарту[6]. Структура Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» па стане на 1 мая 1942 г. уключала ў сябе 111 вакзалаў і службовых інстанцый з геаграфіяй ад Брэст-Літоўска да Смаленска і ад Полацка да Гомеля[7]. Нямецкія чыгуначныя чыноўнікі ганарыліся ў 1943 г. тым, што іх праца была адзначана фюрарам 11 жалезнымі крыжамі другой ступені, шматлікімі крыжамі за ваенныя заслугі першай ступені і крыжамі за ваенныя заслугі другой ступені, а таксама медалямі за ваенныя заслугі. Адзначаны быў у асноўным асабовы склад службы пуці, у першую чаргу – работнікі лакаматываў. Увогуле ўзнагародзілі трэць усіх нямецкіх рабочых і служачых[8].

Рэгуляванне прыцягнення мясцовага персаналу на прадпрыемствах чыгункі вызначалася інструкцыямі па найме і ўзнагароджанні мясцовай рабочай сілы. Першая з іх пачала дзейнічаць з 25 чэрвеня 1941 г.[9] Акупацыйнымі ўладамі вызначалася, што ўсе пасады павінны былі размяркоўвацца паміж мясцовымі работнікамі, за выключэннем тых пасад, якія належала займаць немцам. Асобная ўвага звярталася на тое, каб работнікаў чыгункі не выкарыстоўвалі ў іншых галінах. Абмежаванняў па найме мясцовага персаналу таксама не прадугледжвалася. Дзякуючы гэтаму меркавалася мець запас персаналу і магчымасць скараціць працоўны час.

Нельга было прымаць на працу палітычных камісараў, яўрэяў і, як пазначана ў дакуменце, «паўяўрэяў». Нямецкамоўных грамадзян трэба было наймаць у першую чаргу. Прадугледжвалася апытанне наконт фізічнай прыдатнасці работніка, а таксама (у выпадку неабходнасці) медыцынскі агляд. Кожны работкік уносіўся ў спіс персаналу, дзе пазначаліся наступныя звесткі: бягучы нумар, прозвішча, імя, дата нараджэння, адрас пражывання, апошняя пасада, якую займаў работнік, час уступлення ў палявую чыгунку, від занятку і асобыя ўменні (напрыклад, перакладчык), а таксама дзень і прычына звальнення. Для ідэнтыфікацыі служачы атрымліваў павязку на руку і пропуск. Падкрэслівалася, што выкарыстанне мясцовага насельніцтва на кіруючых і адказных пасадах першапачаткова не разглядалася. Мясцовы персанал не павінен быў мець права аддаваць загады нямецкім супрацоўнікам чыгункі[10].

У матэрыялах калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» змяшчаецца дастаткова вялікі масіў інфармацыі аб колькасці нямецкіх і мясцовых працоўных. Сярод дакументальных крыніц можна сустрэць параўнальныя табліцы з іх суадносінамі, а таксама вялікую колькасць паведамленняў аб колькасці рабочай сілы з ліку нямецкіх і мясцовых работнікаў падраздзяленняў чыгункі акупаванай Беларусі. Па стане на 28 лютага 1943 г. на акупаванай беларускай чыгунцы было занята 20 845 нямецкіх і 64 247 мясцовых работнікаў. Суадносіны паміж імі складалі 1:3,08 (24,5 % і 75,5 %). Найбольшая колькасць мясцовага насельніцтва выкарыстоўвалася на рамонце пуцей (34 596 чалавек), суадносіны нямецкіх і мясцовых работнікаў тут складалі 1 : 9,2. Менш за ўсё мясцовыя працоўныя былі заняты ў службе кіравання (звязанай з тэхнікай) (478 немцаў). Сярод кіроўцаў аўтамабіляў (244 немцы) мясцовых не было ўвогуле. Вялікая колькасць немцаў працавалі машыністамі паравых цягнікоў і на суправаджэнні цягнікоў. Машыністамі працавала 2909 немцаў і 1942 мясцовых работнікаў, а на суправаджэнні – 1503 немцаў і 1417 мясцовых. Дэталёва суадносіны нямецкага і мясцовага персаналу раскрывае табл. 1.

[5]Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 378. Воп. 1. Спр. 565. Арк. 54.
[6]Там жа. Спр. 565. Арк. 55.
[7]Там жа. Спр. 462. Арк. 75–79.
[8]Там жа. Спр. 565. Арк. 55 адв.
[9]Там жа. Спр. 48. Арк. 3–3 адв., 4–4 адв., 5–5 адв.
[10]Там жа. Спр. 326. Арк. 31 адв.

Табліца 1

**Колькасць немцаў і мясцовых жыхароў,
якія працавалі на чыгунцы, па стане на 28 лютага 1943 г.**

Table 1

**Number of Germans and locals
who worked on the railway as of 28 February 1943**

| Месца занятасці | Немцы, чал. | Мясцовыя жыхары, чал. | Суадносіны |
|---|---|---|---|
| Служба кіравання (не звязаная з тэхнікай) | 804 | 1274 | 1:1,6 |
| Служба кіравання (звязаная з тэхнікай) | 478 | 0 | – |
| Служба кіравання (склады) | 114 | 205 | 1 : 1,8 |
| Рамонт пуцей | 3570 | 34 596 | 1:9,2 |
| Ахова пуцей | 915 | 2541 | 1:2,7 |
| Служба эксплуатацыі | 5546 | 8617 | 1:1,6 |
| Суправаджэнне цягнікоў | 1503 | 1417 | 1,1:1 |
| Вытворчы аддзел | 1660 | 7317 | 1:4,4 |
| Майстэрня | 1744 | 3194 | 1:1,8 |
| Машыніст паравых цягнікоў | 2902 | 1942 | 1,6:1 |
| Вадзіцель аўтамабіля | 244 | 0 | – |
| Лакаматыўнае дэпо | 1365 | 3144 | 1:2,3 |
| Усяго | 20 845 | 64 247 | 1:3,08 |

Крыніца: НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 577. Арк. 37.
Source: Natl. Arch. of the Repub. of Belarus. Fond 378. Invent. 1. File 577. Sheet 37.

Уяўленні аб суадносінах мясцовых работнікаў і немцаў даюць паведамленні аб колькасці рабочай сілы і незадаволенай патрэбе ў персанале падраздзяленняў чыгуначнага прадпрыемства «Дойчэ Райхсбан». Згаданыя паведамленні ўяўляюць сабой стандартныя фармуляры, якія складаліся на падставе звестак структурных падраздзяленняў чыгункі і розных упраўленняў, а таксама бірж працы. Паведамленні ўтрымлівалі інфармацыю аб наяўнай працоўнай сіле па наступных пазіцыях: імперскія немцы, мясцовыя жыхары, замежнікі, яўрэі, вучні і ваеннапалонныя, – а таксама змяшчалі даныя аб незадаволенай патрэбе ў мясцовых работніках-спецыялістах, дапаможных рабочых і вучнях.

Для аналізу былі абраны паведамленні за 15 верасня 1943 г. (іх захавалася найбольшая колькасць: 100 паведамленняў з Мінска, Полацка, Маладзечна, Оршы, Ліды), якія з'яўляюцца найбольш поўнымі. Дакументы не вызначаюць агульную колькасць работнікаў на чыгунцы, але даюць магчымасць уявіць структуру занятасці. У паведамленнях сцвярджаецца, што сітуацыя з занятасцю на чыгунцы адзначаных гарадоў была наступная: імперскія немцы – 6606 чалавек, мясцовыя жыхары – 23475 чалавек. Таксама на чыгунцы было занята 54 замежнікі, 631 яўрэй, 456 вучняў і 369 ваеннапалонных. У той жа час адзначалася незадаволеная патрэба ў 649 мясцовых работніках-спецыялістах, 2052 дапаможных рабочых і 66 вучнях[11].

У дакументах Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» магчыма знайсці інфармацыю аб узроставым і гендарным складзе работнікаў (справаздачы па ўліку наяўных работнікаў). Так, у выяўленых дакументах за 1943 г.[12] можна вылучыць пэўныя тэндэнцыі ў дачыненні да ўзроставага і гендарнага складу прыцягнутых да працы мясцовых рабочых. Наяўныя дакументы з асобных прадпрыемстваў чыгункі датычацца 6228 чалавек. У гендарным аспекце пераважалі работнікі мужчынскага полу (4656 чалавек), колькасць жанчын – 1572 чалавек. Наглядна суадносіны мужчын і жанчын розных узростаў адлюстроўвае табл. 2.

[11]НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 629. Арк. 10, 11, 12, 15; Спр. 630. Арк. 1-8, 10-91.
[12]Там жа. Спр. 577. Арк. 19 адв., 21 адв., 23 адв., 41 адв., 44 адв. ; Спр. 624, арк. 12, 13 адв., 14 адв., 15, 16 адв., 27 адв., 29 адв., 31 адв.

Табліца 2

**Узроставы і гендарны склад работнікаў чыгункі**

Table 2

**The age and gender composition of railway workers**

| Узрост | Мужчыны, чал. (%) | Жанчыны, чал. (%) |
|---|---|---|
| Да 16 гадоў | 137 (3) | 116 (7,4) |
| 16–18 гадоў | 504 (10,8) | 350 (22,3) |
| Больш за 18 гадоў | 4015 (83,2) | 1106 (70,3) |
| Усяго | 4656 (74,8) | 1572 (25,2) |

Дастаткова шырока выкарыстоўвалася праца дзяцей і моладзі да 16 гадоў, якія пераважна працавалі вучнямі сталяра, слесара і інш. Жанчыны былі заняты практычна на ўсіх цяжкіх працах: рамонт рэйкавых пуцей і стрэлак, замена шпал. Акрамя таго, яны працавалі прыбіральшчыцамі, паварамі, пісарамі, у ахове пуцей і шлагбаумаў і інш. У асноўным гэта была некваліфікаваная фізічная праца, якую не кожная жанчына магла вытрымаць. Значным попытам карысталіся кваліфікаваныя спецыялісты.

Найбольш запатрабаванымі спецыяльнасцямі на прадпрыемствах чыгункі (зыходзячы з заявак на рабочую сілу біржы працы г. Мінска на 15 жніўня 1943 г.), акрамя падсобных рабочых, попыт на якіх быў самы высокі, з'яўляліся слесары і вучні слесара (123 заяўкі), столяры (121), муляры (77), цесляры (60), электрыкі (53), маляры (32) і токары (31). У значна меншай ступені патрабаваліся цырульнікі (1), токары па метале (2), інжынеры (2), ліцейшчыкі (2), друкары (2), шорнікі (2), механікі (3), краўцы (3). Таксама былі патрэбны машыністы (10), вадаправодчыкі (9), страхары (11), бляхары (17), зваршчыкі (14), трубаўкладчыкі (6) і мастакі (6 заявак)[13].

Асаблівую цікавасць выклікае ацэнка патэнцыялу мясцовага персалалу ў аналітычнай запісцы аб заахвочванні рабочых, падрыхтаванай 22 чэрвеня 1942 г. Даследаванне адбывалася ў розных чыгуначных службах заходняй і ўсходняй частак Беларусі, або, як называў іх аўтар запіскі, польскай і рускай абласцей. Паводле характарыстыкі, мясцовыя работнікі, асабліва з усходняй Беларусі, толькі за рэдкім выключэннем разглядаліся акупацыйнымі ўладамі як паўнавартасная і найдзейная рабочая сіла. «Рускі хутчэй вызначаецца як палова работніка. Ён працуе неахвотна, вяла і безадказна. Паляк цэніцца як больш спрытны і жадаючы працаваць»[14] (тут і далей пераклад выкананы членамі часовага навуковага калектыву на кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта ў рамках Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці, нацыі і культуры» на 2011–2015 гг.). Аднак ужо ў 1942 г. адзначаецца, што і ў польскай, і ў рускай абласцях нарастала абыякавасць і ўхіленне ад працы, што выклікала сур'ёзную апаску і контрмеры. Прычынамі такой з'явы былі варожая прапаганда і дзеянні партызан, напады якіх сталі ўсё больш частымі. Нежаданне працаваць паходзіла таксама ад недастатковага забеспячэння прадуктамі харчавання, якое асабліва моцна адбівалася на гарадскіх жыхарах, а таксама ў зусім недастатковай, на думку мясцовых, аплаце працы. Невялікая заработная плата яшчэ больш абясцэньвалася з-за амаль поўнай адсутнасці тавараў. Сродкаў не хапала на пражытак ні самога мясцовага работніка, ні яго сям'і нават пры наяўнасці добрай прадукцыйнасці. Работнік быў вымушаны звяртацца да чорнага рынку. На станцыях, дзе цягнікі рэгулярна спыняліся, мясцовыя адкрыта жабравалі або, хаваючыся, мянялі яйкі, свіное сала, масла і іншыя прадукты на сахарын, тытунёвыя вырабы, шнапс, кансервы, мыла і прадметы першай неабходнасці любога выгляду. Прадукты работнікі набывалі ў прылеглых да чыгункі раёнах у сялян, якім яны маглі выгадна прадаць атрыманыя пры абмене тавары, у асаблівасці шнапс і тытунёвыя вырабы, пры гэтым з'яўляўся грашовы або рэчавы прыбытак. Прычым грошы, якія зараблялiся на чыгунцы, заставаліся па большай частцы нявыкарыстанымі, што тлумачыць магчымасць мясцовых работнікаў аплаціць асабліва пажаданыя прадметы спажывання (гадзіннікі, кішэнныя нажы, запальнічкі і прадукты харчавання), цэны на якія былі вельмі завышаны. Такі абмен адбываўся звычайна ў працоўны час, што вяло да змяншэння прадукцыйнасці працы. Аднак з гэтага не вынікала, што зацікаўленасць мясцовага персаналу ў грошах знізілася. Адваротнае даказала неабходнасць зніжэння заработнай платы. Яна пацягнула за сабой расчараванне і нежаданне працаваць[15].

Дырэктыва аб аплаце працы мясцовага персаналу была выдадзена 1 ліпеня 1942 г. Яна прадугледжвала падзел па тарыфных разрадах, пасадах і падзённай аплаце працы ў рэйхсмарках, што адлюстравана ў табл. 3.

[13]НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 654. Арк. 40–41.
[14]Там жа. Спр. 210. Арк. 56–58.
[15]Там жа. Спр. 191. Арк. 156.

Табліца 3

**Аплата працы мясцовага персаналу чыгункі**

Table 3

**Remuneration of local staff of the railway**

| Тарыфны разрад | Пасада | Падзённая заработная плата, рэйхсмаркі |
|---|---|---|
| 1 | Вакзальны рабочы, дзяжурны па чыгуначным пераездзе | 0,96 |
| 2 | Ачышчальнік стрэлачных перакладаў, стрэлачны перакладчык, счэпшчык | 1,2 |
| 3 | Стрэлачнік цэнтральнага паста, наглядчык счаплення цягнікоў, кандуктар цягніка | 1,4 |
| 4 | Начальнік цягніка, брыгадзір | 1,6 |
| 5 | Брыгадзір | 2,0 |

Крыніца: НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 191. Арк. 157.
Source: Nat. Arch. of the Repub. of Belarus. Fond 378. Invent. 1. File 191. Sheet 157.

За выдатныя поспехі ў працы або за асабліва адказную і якасную працу магла быць выплачана прэмія памерам да 50 % заработнай платы, якая не перавышала 20 % асноўнай аплаты кожнага тарыфнага разраду.

Сацыяльныя надбаўкі не прадугледжваліся. У выпадку хваробы заработная плата складала 50 % ад звычайнай. Прадстаўлялася бясплатная медыцынская дапамога работнікам і іх сем'ям, якая ажыццяўлялася мясцовымі ўрачамі.

Велічыня заработнай платы ацэньвалася як занадта нізкая ў асноўным таму, што мясцовыя работнікі былі вымушаны дадаткова купляць празмерна дарагія прадметы першай неабходнасці. На чорным рынку, напрыклад, адна булка хлеба каштавала ад 4 да 12 рэйхсмарак, адно яйка – да 0,8 рэйхсмарак[16].

Аплата працы была прыблізна аднолькавая на ўсіх прадпрыемствах. У дакументах захаваліся ведамасці аб выдачы заробку за чэрвень 1942 г. па горадабудаўнічым упраўленні, лясніцтве, вайсковай кухні, мясцовым ваенным шпіталі, рэчавым складзе, геадэзічнай станцыі. Характэрна, што ў ведамасцях можна ўбачыць яўрэйскія імёны і прозвішчы: Лебе Рубінштэйн, Яфім Капідай, Лара Голдзіна, Соня Эпштайн, Рыма Фельдман і г. д. Першапачаткова, як адзначалася, існавала забарона на выкарыстанне працы яўрэяў і «паўяўрэяў». Аднак да канца 1941 г. сітуацыя з працаўладкаваннем яўрэяў на прадпрыемствах чыгункі змяняецца. Патрэба ў прафесійных кадрах і правал маланкавай вайны вымусілі дазволіць іх працу. Яўрэйскія рабочыя павінны былі атрымліваць прадукты харчавання замест грашовых узнагарод. У асобных выпадках дапускалася выплата да 80 % акладу, адпаведнага іх дзейнасці, без надбавак. Дакументальныя крыніцы даюць фрагментарныя звесткі адносна колькаснага аспекту выкарыстання працы яўрэяў. У матэрыялах архіва ўтрымліваюцца штодзённыя справаздачы за ліпень 1942 г. фірмы *C. & F. Lehmann*, у якіх можна прасачыць маштабы працы яўрэяў на будоўлях у Мінску. У ліпені 1942 г. там было задзейнічана 193 яўрэйскія рабочыя[17], у жніўні 1942 г. – 199 яўрэяў[18], у кастрычніку 1942 г. – 35 яўрэяў-мужчын і 126 жанчын[19], у лістападзе 1942 г. – 44 яўрэя-мужчыны і 134 жанчыны[20].

Згодна з дакументамі аб занятасці мясцовых рабочых, у кацельні з 16 па 31 студзеня 1942 г. рабочы дзень у залежнасці ад прафесіі складаў ад 8 да 12 гадзін, у некаторых выпадках – 16 гадзін. Больш за ўсіх працавалі тэхнікі і слесары (па 10–12 гадзін), апальшчыкі і рабочыя (па 8 гадзін). Рабочы тыдзень складаў 7 дзён[21].

Першапачатковыя дырэктывы і інструкцыі не прывялі, па меркаванні акупацыйных улад, да здавальняючага ўзроўню працы мясцовых работнікаў. Сітуацыя на фронце, рост уздзеяння партызанскіх фарміраванняў спрыялі перагляду падыходаў да ўзаемадзеяння акупантаў з мясцовым персаналам. Акупанты ўсё больш задаваліся пытаннем павышэння прадукцыйнасці працы. З гэтай мэтай 15 кастрычніка 1942 г. была падрыхтавана аналітычная запіска «Аб мэтанакіраванай сістэме аплаты працы рускіх працоўных і яе ўплыве на прадукцыйнасць і павелічэнне прадукцыйнасці». Аўтар падкрэсліваў неабходнасць улічваць асаблівасці «рускага менталітэту», каб выхаваць і сфарміраваць рускіх як прадукцыйных і надзейных рабочых. У выніку

[16]НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 191. Арк. 158.
[17]Там жа. Спр. 529. Арк. 2.
[18]Там жа. Арк. 31.
[19]Там жа. Арк. 13.
[20]Там жа. Арк. 32.
[21]Там жа. Спр. 406. Арк. 12.

«рускія будуць бачыць у немцах не прыгнятальнікаў і эксплуататараў, а вызваліцеляў з-пад бальшавіцкага гнёту»[22].

Акрамя заўваг наконт асаблівацей менталітэту, вынікам аналітычнай запіскі стала зацвярджэнне 29 лістапада 1942 г. новай Інструкцыі аб выкарыстанні і павышэнні прадукцыйнасці працы мясцовай рабочай сілы і ваеннапалонных[23]. Падыходы да мясцовага насельніцтва істотна змяніліся: працягласць працы мусіла быць аднолькавай з працягласцю працоўнага дня імперскіх немцаў, а наступны прынцып выкарыстання працы мясцовага насельніцтва павінен быў стаць асноўным: «Кожны на сваім працоўным месцы». Падкрэслівалася, што кваліфікаваных рабочых дазвалялася выкарыстоўваць толькі ў адпаведнасці з іх адукацыяй. Каштоўныя нямецкія спецыялісты павінны былі вызваляцца праз замену іх мясцовымі кваліфікаванымі рабочымі. Забаранялася займаць мясцовых кваліфікаваных рабочых на неадпаведных іх кваліфікацыі работах. Прадугледжвалася павышэнне кваліфікацыі або перападрыхтоўка. Таксама мясцовых работнікаў прынцыпова забаранялася звальняць, магчымым быў толькі перавод на новыя ўчасткі чыгункі. Дэфіцыт рабочых сказваўся, на што акупацыйныя ўлады адзначалі: «Працоўная сіла з прадукцыйнасцю 30 % лепш, чым ніякая»[24].

Уяўленне аб харчовым забеспячэнні работнікаў даюць інфармацыйныя лісты, датаваныя чэрвенем і жніўнем 1943 г., з пунктаў тэхнічнага абслугоўвання ў Жыткавічах, Мікашэвічах, Лідзе і Валожыне. Яны ўяўляюць сабой своеасаблівую анкету, на падставе якой планавалася высветліць наступныя пытанні: «Ці забяспечвае пункт тэхнічнага абслугоўвання прадукты харчавання для ўсіх?», «Ці прадстаўляецца поўнае харчаванне ў сталовай (абед і вячэра)?», «Ці прадстаўляецца частковае харчаванне ў сталовай?», «Ці выдаюцца прадукты харчавання ў сырым выглядзе?». Даныя анкетавання сведчаць, што ўсе пункты абслугоўвання цалкам ці часткова забяспечвалі прадукты харчавання для работнікаў. У той жа час нідзе не давалася поўнае ці частковае харчаванне ў сталовай, а прадукты выдаваліся ў сырым выглядзе, акрамя Ліды, дзе не выдавалі харчаванне нават так[25]. Анкеты таксама даюць уяўленне аб колькасці прадуктаў, якія атрымлівалі работнікі. На тыдзень выдавалася мука – ад 1350 да 2800 г, тлушч – ад 70 да 290 (выдаваўся толькі ў Мікашэвічах і Валожыне), мяса – ад 190 да 300 (атрымлівалі не ўсюды), бульба – 5000 (толькі ў Валожыне і Жыткавічах), ячныя крупы – ад 280 да 370 (Мікашэвічы і Валожын), соль – 100 (Мікашэвічы і Валожын), мука – 70, гарох – 280, табака – 100 г, сахарын – 100 таблетак, папіросы – 40 шт. (толькі Ліда)[26]. Натуральна, што такое харчовае забеспячэнне не магло стварыць належных умоў жыцця і працы і не з’яўлялася дастатковым. У яшчэ больш складаных умовах знаходзіліся ваеннапалонныя, якіх выкарыстоўвалі на работах.

Нацысцкія ўлады разумелі неабходнасць вырашэння праблемы харчавання як мясцовых работнікаў, так і ваеннапалонных і рабілі пэўныя крокі з гэтай мэтай. Так, у Баранавічах 15 красавіка 1943 г. паведамлялася, што нямецкая фірма «Шцёр», якая неадкладна павінна была заняць 470 ваеннапалонных, змагла набыць вялікую колькасць конскага мяса і прадуктаў харчавання. Дзякуючы гэтаму дадатковаму харчаванню было дасягнута значнае паляпшэнне працаздольнасці ваеннапалонных. Акупацыйнымі ўладамі адзначалася: «Трэба спрабаваць дабіцца гэтага дадатковага харчавання таксама для тых ваеннапалонных, для якіх яно яшчэ не было дасягнута. Ва ўсялякім выпадку, больш-менш дастатковае харчаванне вельмі ўплывае на працаздольнасць ваеннапалонных і іх жаданне працаваць»[27]. Асобную надбаўку, зыходзячы з паведамленняў акупацыйных улад, атрымлівалі рабочыя і ваеннапалонныя, якія выконвалі цяжкую працу. Так, у Магілёве 28 сакавіка 1943 г. паведамлялася аб 47 ваеннапалонных, занятых на цяжкіх працах, якім на 7 дзён выдзялялася для спажывання наступная колькасць прадуктаў: бульба – 310,5 кг, макаронныя вырабы – 6,75, джэм – 10,5, соль – 13,5, цукар – 2,5, гарбата – 0,65, мяса – 13, сала – 2,7, таматы – 10,8, буракі – 46, бручка – 27, мука – 6,5 кг, хлеб – 81 буханка. Выдзялялася дадатковая колькасць проса і папярос. Вынікі працы ваеннапалонных да гэтага моманту былі здавальняючымі для акупацыйных улад[28]. Выкарыстанне ваеннапалонных фрагментарна адлюстравана ў дакументальных матэрыялах. Па стане на 5 красавіка 1942 г. мінскі ўчастак чыгункі абслугоўвалі 15 лагераў для ваеннапалонных, дзе знаходзілася 1474 чалавекі, з якіх на працах на чыгунцы было занята 987. Задзейнічаны яны былі пераважна на будаўніцтве драўляных пабудоў, уборцы льду і снегу, жылых памяшканняў. Сярод вартаўнікоў былі немцы і ўкраінцы[29]. У красавіку 1943 г. у 34 лагерах і аб’ектах чыгункі была выкарыстана праца 2536 ваеннапалонных[30]. У дакументах адзначаны 33 смяротныя выпадкі[31].

[22]НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 326. Арк. 31 адв.
[23]Там жа. Спр. 307. Арк. 22.
[24]Там жа. Арк. 22 адв.
[25]Там жа. Спр. 622. Арк. 1, 9, 11, 19, 23.
[26]Там жа. Арк.1, 4, 11, 19.
[27]Там жа. Спр. 670. Арк. 7.
[28]Там жа. Арк. 12.
[29]Там жа. Спр. 312. Арк. 5.
[30]Там жа. Спр. 191. Арк. 184–184 адв.
[31]Там жа. Спр. 312. Арк. 4 адв.

Патрэба ў мясцовых працоўных рэсурсах на прадпрыемствах чыгункі заўсёды заставалася высокай і так і не была вырашана. Акупацыйнай адміністрацыяй адзначалася, што па стане на 15 жніўня 1943 г. патрабавалася 16 040 рабочых, з якіх кваліфікаваных спецыялістаў – 3685 чалавек, падсобных рабочых – 11 632 і вучняў – 729 чалавек.[32]

Нацысцкія ўлады спрабавалі паўплываць на павелічэнне прадукцыйнасці працы мясцовых жыхароў і іх жаданне працаваць. Для гэтага выкарыстоўваліся разнастайныя метады, якія апісваюцца ў цыркуляры Імперскага транспартнага кіраўніцтва ў г. Мінску ад 29 сакавіка 1943 г. Згадваліся наступныя магчымасці аказання дапамогі мясцовым жыхарам: надбаўкі да заработнай платы, прэміяльная і здзельная аплата працы, узнагароджанні (за ліквідацыю вытворчай небяспекі, абарону ад партызан і г. д.), прэміі для мясцовых машыністаў і вучняў машыністаў, асігнаванне прадуктаў харчавання і далікатэсаў, а таксама арганізацыя дапамогі параненым, сем'ям загінулых. Велічыня ўзнагароджанняў ва ўсіх выпадках павінна была абмяжоўвацца чвэрцю прадугледжаннай для немцаў сумы. Але ў асобных выпадках было магчыма пры выключных выніках выплаціць узнагароджанне да 50 рэйхсмарак. Узнагароджанні маглі выплачвацца і не работнікам чыгункі, што асабліва датычылася выпадкаў знаходжання мін мясцовымі жыхарамі.[33]

Акупанты спрабавалі наладзіць сістэму сацыяльнага забеспячэння работнікаў чыгункі з ліку мясцовых жыхароў. Гэтага пытання датычыўся цыркулярны ліст гарадскога камісара г. Мінска і біржы працы г. Мінска ад 29 студзеня 1944 г. адносна забеспячэння мясцовых працоўных у выпадку хваробы, няшчаснага выпадку і пры асобых умовах. Забеспячэнню кампенсацыяй пры хваробе або няшчасным выпадку падлягалі ўсе рабочыя і служачыя, якія знаходзіліся на працы, незалежна ад іх занятку. Сюды таксама адносіліся памагатыя паліцыянтаў, паліцыянты і дапаможныя службоўцы вермахта, а таксама эвакуіраваныя з іншых абласцей[34].

Неабходна адзначыць, што акупацыйныя ўлады надавалі функцыянаванню чыгуначных служб выключнае значэнне і спрабавалі рабіць усё неабходнае для забеспячэння працы і ўтрымання персаналу чыгункі. Гэта пацвярджае і дырэктыва аб эвакуацыі, выдадзеная Імперскім транспартным кіраўніцтвам у г. Мінску 22 чэрвеня 1944 г., у якой падкрэслівалася: «Сёння любы асобны рабочы, які застаецца як пры чыгунцы рэйху, так і пры абароннай прамысловасці на Радзіме ці які паступае на працу, уяўляе сабой каштоўную маёмасць і ўмацоўвае абараназдольнасць! Але кожны рабочы, які зноў трапляе ў распараджэнне бальшавікоў, азначае паслабленне нашай і павелічэнне варожай абараназдольнасці!» Эвакуацыю планавалася праводзіць пад наступным лозунгам: «Ніводны працоўны не павінен патрапіць у рукі рускіх! Кожны чыгуначнік павінен зноў быць дастаўлены ў штаб чыгункі акупіраванай вобласці ці ў рэйх!» Галоўным сродкам уплыву на мясцовы персанал, каб ён добраахвотна эвакуіраваўся і загадзя не ўцякаў, планавалася зрабіць прапаганду[35].

Усе гэтыя меры не давалі добрых вынікаў. Ужо падчас складання інфармацыйных лістоў у чэрвені і жніўні 1943 г. у Жыткавічах, Мікашэвічах, Лідзе і Валожыне адзначалася, што з працы збеглі 27 чалавек[36]. Уцёкі фіксаваліся акупацыйнымі ўладамі пры праверцы чыгуначных служб у Гомелі ў жніўні 1943 г. Сцвярджалася, што ў сярэднім каля 510 чалавек адсутнічалі кожны дзень без істотных прычын[37]. Выказвалася меркаванне, што яны перабеглі да партызан. Расследаванні штабаў, служб бяспекі і чыгуначнай паліцыі ўвесь час праходзілі безвынікова[38].

Акупацыйныя ўлады падкрэслівалі, што ў большасці выпадкаў адсутнасць дысцыпліны спрыяла партызанскім акцыям. Сярод парушэнняў часцей за ўсё называлася ўжыванне алкаголю, небяспечнымі лічыліся зносіны з мясцовымі, асабліва з жанчынамі. На вытворчых сходах акцэнтавалася ўвага на магчымай небяспецы[39].

Паражэнні на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а таксама аперацыі партызан па зрыве мерапрыемстваў акупацыйных улад уносілі свае карэктывы ў намеры выкарыстання працы мясцовага насельніцтва. Работнікі вельмі часта станавіліся сувязнымі ці давалі партызанам і падпольшчыкам неабходную інфармацыю. Германскія службы контрразведкі накіравалі 3 студзеня 1944 г. у Галоўную чыгуначную дырэкцыю «Мінск» данясенне з характарыстыкай выпадкаў супрацоўніцтва з партызанамі і рэкамендацыямі адносна выкарыстання працы мясцовага насельніцтва на чыгунцы. Абгрунтоўвалася неабходнасць абмежавання доступу мясцовых рабочых да дакументацыі, узмацнення кантролю за іх паштовымі адпраўленнямі. Частымі былі выпадкі выкарыстання жанчын у якасці партызанскай агентуры. Сцвярджалася, што савецкія жанчыны, асабліва інтэлігентных прафесій –

[32]НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 654. Арк. 38, 39, 42–44, 47–68.
[33]Там жа. Спр. 577. Арк. 9–13.
[34]Там жа. Спр. 591. Арк. 70–72 адв.
[35]Там жа. Арк. 45.
[36]Там жа. Спр. 622. Арк. 1, 4, 11, 19.
[37]Там жа. Спр. 191. Арк. 184–184 адв.
[38]Там жа. Спр. 586. Арк. 9–10.
[39]Там жа. Спр. 1020. Арк. 2.

настаўніцы, урачы, інжынеры, – часцей за ўсё з'яўляюцца заўзятымі камуністкамі, таму на іх трэба звяртаць пільную ўвагу. Падкрэслівалася неабходнасць пры перамяшчэннях паблізу лініі фронту ці тэрыторыі партызан трымаць нагатове зброю, не хадзіць па адным, пазбягаць тых жа дарог і часу паездкі, узмацніць ахову кватэр. Асобная ўвага звярталася на магчымыя падробкі бланкаў і пячатак[40]. Недапушчальнымі былі агульныя фотаздымкі рускіх і нямецкіх чыгуначнікаў, бо такім чынам раскрывалі сакрэтных агентаў, таксама загадвалася трымаць напагатове гаручае для своечасовага знішчэння дакументаў. Прадпісвалася пільна сачыць і ахоўваць тэхнічныя збудаванні, кухні, падвальныя памяшканні, шахты для загрузкі вугалю[41].

Наяўныя матэрыялы крыніц калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» даюць фрагментарную інфармацыю адносна праблемы выкарыстання мясцовага насельніцтва на прадпрыемствах акупаванай Беларусі. Масіў факталагічнай інфармацыі з цяжкасцю паддаецца абагульненню і генералізацыі, але дазваляе зрабіць пэўныя высновы, якія маюць у тым ліку і канцэптуальны характар. Акупацыйныя ўлады надавалі выключнае значэнне пытанню здабыцця падтрымкі насельніцтва Беларусі. З гэтай мэтай распрацоўваліся дырэктыўныя дакументы, інструкцыі, цыркуляры, аналізаваліся настроі і працоўны патэнцыял мясцовых работнікаў і ваеннапалонных. Акупанты разумелі, што германскія планы на ўсходзе, як і сама перамога ў вайне, у значнай ступені залежаць ад стаўлення да іх мясцовага насельніцтва. Першапачатковыя намеры выключна жорсткага выкарыстання амаль бяспраўных мясцовых работнікаў хутка сутыкнуліся з рэчаіснасцю. Акупацыйная адміністрацыя звярталася да іншых сродкаў заахвочвання і павышэння прадукцыйнасці працы мясцовых работнікаў. Акрамя рэпрэсіўнага ўздзеяння і арганізацыі сістэмы кантролю, ставіліся пытанні забеспячэння прадуктамі, стварэння пэўных сацыяльных гарантый, праводзіліся мерапрыемствы, накіраваныя на павелічэнне прадукцыйнасці і стымуляванне працы: надбаўкі да заработнай платы, прэміяльныя, здзельная аплата працы, узнагароджанні, выдача прадуктаў і далікатэсаў, дабрачынная дзейнасць і дапамога сем'ям супрацоўнікаў. Але ва ўмовах уздзеяння партызанскіх фарміраванняў гэтыя захады не давалі асаблівых вынікаў. Акупацыйнымі ўладамі рэгулярна адзначалася нізкае жаданне працаваць і ўцёкі мясцовых рабочых да партызан. Уплыў апошніх быў асабліва моцным у сельскай мясцовасці, гэта значна змяншала магчымасці выкарыстання мясцовых рабочых, попыт на якіх у гады германскай акупацыі Беларусі заўсёды заставаўся вельмі высокім.

Дакументы Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» змяшчаюць унікальную інфармацыю, якая дазваляе істотна пашырыць факталагічную базу даследаванняў перыяду акупацыі Беларусі. Увядзенне ў навуковы зварот новых крыніц дазваляе паставіць тэарэтычныя пытанні адносна навуковых схем і падыходаў да аналізу акупацыйнага перыяду. Неабходна дапоўніць ранейшыя канцэптуальныя ацэнкі выкарыстання германскімі акупацыйнымі ўладамі працы мясцовага насельніцтва як прымусовай рабскай працы новым падыходам, заснаваным на характарыстыцы штодзённых вытворчых узаемаадносін у акупаванай Беларусі. Выкарыстоўваючы ўведзеныя ў навуковы зварот крыніцы, а таксама сучасныя метадалагічныя падыходы, варта аналізаваць стратэгіі выжывання насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі. Інфармацыя трафейных германскіх дакументаў ставіць перад даследчыкамі пытанні аб умовах выжывання мясцовых работнікаў на іншых прадпрыемствах, у іншых сферах працы і асобных рэгіёнах акупаванай тэрыторыі Беларусі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Кнатько ГД, Адамушко ВИ, Бондаренко НА, Селеменев ВД. *Белорусские остарбайтеры: историко-аналитическое исследование*. Минск: НАРБ; 2001. 335 с.

2. Літвін АМ, рэдактар. *Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)*. Мінск: Медисонт; 2010. 210 с.

3. Літвін АМ, Грэбень ЯА, Новікаў СЯ. *Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі, 1941–1945 гг.* Мінск: Тесей; 2010. 581 с.

4. Гребень ЕА. *Гражданское население Беларуси в условиях немецкой оккупации (1941–1944 гг.)*. Минск: БГАТУ; 2016. 496 с.

5. Herbert U. *Fremdarbeiter: Politik und Praxis des «Ausländer-Einsatzes» in der Kriegswirtschaft des Dritten Reiches*. Bonn: Verlag J. H. W. Dietz; 1999. 589 S.

6. Spoerer M. *Zwangsarbeit unter dem Hakenkreuz. Ausländische Zivilarbeiter, Kriegsgefangene und Häftlinge im Deutschen Reich und im besetzten Europa 1939–1945*. Stuttgart: Deutsche Verlags-Anstalt; 2001. 229 S.

7. Gerlach C. *Kalkulierte Morde. Die Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944. 2 Auflage*. Hamburg: Hamburger Ed.; 2000. 1232 S.

8. К'яры Б. *Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944)*. Мінск: [б. в.]; 2008. 389 с.

[40]НАРБ. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 1011. Арк. 45.

[41]Там жа. Арк. 46.

## References

1. Knat'ko GD, Adamushko VI, Bondarenko NA, Selemenev VD. *Belorusskie ostarbaitery: istoriko-analiticheskoe issledovanie* [Belarusian ostarbeiters: historical and analytical research]. Minsk: National archives of the Republic of Belarus; 2001. 335 p. Russian.

2. Litvin AM, editor. *Raznjavolenaja pamjac'. Prymusovaja praca belaruskih gramadzjan na akupavanaj tjerytoryi Belarusi (1941–1944 gg.)* [Liberated memory. Forced labour of Belarusian citizens in the occupied territory of Belarus (1941–1944): collection of scientific articles]. Minsk: Medisont; 2010. 210 p. Belarusian.

3. Litvin AM, Greben' YaA, Novikov SYa. *Vjartanne w rabstva: prymusovaja praca nasel'nictva Belarusi, 1941–1945 gg.* [Return to slavery: forced labour of the population of Belarus, 1941–1945]. Minsk: Theseus; 2010. 581 p. Belarusian.

4. Greben' EA. *Grazhdanskoe naselenie Belarusi v usloviyakh nemetskoi okkupatsii (1941–1944 gg.)* [The civilian population of Belarus under the conditions of German occupation (1941–1944)]. Minsk: Belarusian State Agrarian Technical University; 2016. 496 p. Russian.

5. Herbert U. *Fremdarbeiter: Politik und Praxis des «Ausländer-Einsatzes» in der Kriegswirtschaft des Dritten Reiches*. Bonn: Verlag J. H. W. Dietz; 1999. 589 S.

6. Spoerer M. *Zwangsarbeit unter dem Hakenkreuz. Ausländische Zivilarbeiter, Kriegsgefangene und Häftlinge im Deutschen Reich und im besetzten Europa 1939–1945*. Stuttgart: Deutsche Verlags-Anstalt; 2001. 229 S.

7. Gerlach C. *Kalkulierte Morde. Die Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944*. 2 Auflage. Hamburg: Hamburger Ed.; 2000. 1232 S.

8. Chiari B. *Shtodzjonnasc' za linijaj frontu. Akupacyja, kalabaracyja I supraciw u Belarusi (1941–1944)* [Everyday life behind the front line. Occupation, collaboration and resistance in Belarus (1941–1944)]. Minsk: [publisher unknown]; 2008. 389 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 11.06.2019.*
*Received by editorial board 11.06.2019.*